Источник: "Навука" - 2018-02-26

«Скарбы жыцця Максіма Гарэцкага»

Пад такой назвай у Міжнародны дзень роднай мовы 21 лютага Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (ЦНБ) арганізавала культурна-адукацыйную імпрэзу для вучняў 8–10-х класаў, прымеркаваную да 125-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага (1893–1938).

Для юных чытачоў арганізавалі выставу кніг і рукапісаў М.Гарэцкага з фондаў ЦНБ. На сустрэчу з моладдзю быў запрошаны акадэмік НАН Беларусі, пляменнік Максіма Гарэцкага – Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі. Ён павіншаваў усіх са святам роднай мовы і заўважыў, што мова для кожнага народа – найдаражэйшы скарб, які трэба берагчы і захоўваць. Ва ўспамінах пра бацьку Гаўрылу Іванавіча і дзядзьку Максіма Іванавіча Р.Гарэцкі падкрэсліў ролю маці Ефрасінні Міхайлаўны ў выхаванні дзяцей. Менавіта ад яе старэйшы Максім пераняў многія песні.



Вялікі інтарэс удзельнікаў імпрэзы выклікала выстава, на якой дэманстраваліся дакументы з асабістага архіва М. Гарэцкага. Іх на працягу 1970-х гадоў перадавала ў ЦНБ дачка пісьменніка Галіна Максімаўна. Госці сустрэчы атрымалі магчымасць убачыць рукапісы твораў М.Гарэцкага («Камароўская хроніка», «Віленскія камунары», «Скарбы жыцця»), малавядомыя фотаздымкі пісьменніка, узоры яго перапіскі з роднымі ды іншыя дакументы ды інш.

Як вядома, М.Гарэцкі выкладаў беларускую мову і літаратуру на рабфаку БДУ, у Камуністычным універсітэце Беларусі, Мінскім ветэрынарным тэхнікуме, Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, вёў даследчую работу ў Інбелкульце і АН Беларусі. Вынікамі гэтай працы сталі кнігі, падручнікі, слоўнікі, якія захоўваюцца і ў фондах ЦНБ.

Вучні з вялікай зацікаўленасцю гарталі складзеныя М. Гарэцкім «Гісторыю беларускай літаратуры» 1921, 1924 і 1926 гадоў выдання і «Хрэстаматыю беларускай літаратуры» 1923 года, спрабавалі свае сілы ў невялікіх лінгвістычных і тэксталагічных даследаваннях.

"Навука". "Скарбы жыцця Максіма Гарэцкага"